ку СУС улічаны 4 бел. варыянты, запісаныя ў розны час у розных рэгіёнах краіны. Асаблівай мастацкай дасканаласцю і сацыяльнай вастрынёй вылучаецца казка «Мужык і пан», запісаная А.Сержпутоўскім ад казачніка Рэдкага. Тут намаляваны вобраз простага мужыка, надзеленага пачуццём уласнай годнасці, смелага, разумнага, знаходлівага, які «ўмеў з панамі гаварыць». Сваё паведамленне аб няшчасцях у маёнтку — смерці пані, пажары ён пачынае з дробязі — зламанага сцізорыка, паступова пераходзячы да больш істотных страт. Але ён і «заспакойвае» пана, дабіваючы яго апошнім паведамленнем: «Чаго ж пан плача? Пану ж даў Бог і прыбытак... Большая паненка сына мела. Гожы, кажуць, хлопчык, ці бо паніч, от рыхтык як выліты панскі хурман Мікіта».

*Літ.*: Сацыяльна-бытавыя казкі. Мн., 1976; Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка. Кн. 4. Народная проза / Уклад. К.П.Кабашнікаў, А.С.Фядосік, А.В.Цітавец. Мн., 2002.

*К. П. Кабашнікаў.*

**СЦЯПА́Н**, прысвятак *народнага календара*. Адзначаўся 26 снежня (9 студзеня н.ст.) як працяг *Каляд*. Здаўна лічыўся днём найму батракоў, слуг. У народзе казалі: «На святога Сцяпана кажан парабак сабе пан», «На святога Сцяпана парабак лепшы за пана», «На святога Сцяпана знайду другога пана». У хрысціянскім календары ў гэты дзень адзначаецца памяць пра апостала першапакутніка і архідыякана Стафана, які быў ілжыва абвінавачаны ў богаадступніцтве і забіты камянямі. Герб Святога Стафана 23.2.1792 нададзены гораду Радашковічы. Фалькл. вобраз С. ў нар. паданнях пра «Багатыр-гару», пра Сіні калодзеж згадваецца разам з вобразам багатыркі Кацярыны, якая была яго каханаю. На Беларусі імя Сцяпан нярэдка маюць камяні (адзін з Барысавых камянёў у в. Высокі Гарадзец Талачынскага раёна, Сцёп-камень у Докшыцкім раёне). Рускія даследчыкі В.Іваноў і У.Тапароў лічаць, што С. стаў своеасаблівай заменай Грамавіка, Перуна. Бел. археолаг Э.Зайкоўскі вобраз С. звязвае з Вялесам. С. лічаць апекуном свойскай жывёлы, асабліва коней, у гэты дзень праводзяцца гулянні з песнямі, танцамі, гульнямі і забавамі моладзі, спецыяльнымі абрадавымі дзеяннямі, накіраванымі на забеспячэнне багацця і дастатку ў сям'і.

*Літ.*: Зайкоўскі Э. Багі старажытнай Беларусі. Язычніцкі пантэон: Вялес. Хто такія Кацярына і Сцяпан? // Роднае слова. 1996. № 12; Беларускі народны каляндар. Мн., 2002; Прыказкі і прымаўкі. Мн., 1976.

*М. А. Бабчанок.*

**СЦЯШКО́ВІЧ** Таццяна Пілілаўна (25.12.1904, г. Чэрвень — 6.11.1986), мовазнавец. Кандыдат філалагічных навук (1956). Заслужаная настаўніца Беларусі (1947). Скончыла Бел. дзяржаўны універсітэт (1930). Настаўнічала. З 1947 у Гродзенскім педагагічным інстытуце (у 1957—74 загадчык кафедры бел. мовы). Даследавала гісторыю бел. мовы, дыялектную лексіку, слоаўтварэнне. У працах «З назіранняў над мовай К.Крапівы» (1961), «Мова твораў Міхася Лынькова» (1965) асвятляла пытанне стылістычнага выкарыстання прыказак, прымавак і фразеалагізмаў. У зборніку «Прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы, выслоўі народных гаворак Гродзенскай вобласці» (1968) больш за 1600 парэміялагічных і фразеалагічных адзінак, сабраных С. у розных раёнах Гродзеншчыны і пададзеных з паказам месца запісу. Большасць з іх увайшла ў «Матэрыялы да слоўніка Гродзенскай вобласці» (1972). У «Слоўніку Гродзенскай вобласці» (1983) змясціла 18 загадак і каля 1200 фразеалагізмаў і прыказак з сэнсавай характарыстыкай і пашпартызаваным ілюстрацыйным матэрыялам.

*І. Я. Лепешаў.*

«**СШЫ́ТЫ КОНЬ**», сюжэт казкі-небыліцы СУС 1889 Р = АА *1912. Вядомы ў публікацыях Е.Раманава, П.Чубінскага, П.Шэйна, змешчаны ў томе БНТ «Сацыяльна-бытавыя казкі» (1976). Усе ўлічаныя бел. казкі з гэтым сюжэтам кантамінаваны з інш. сюжэтамі казак-небыліц. Напрыклад, у казцы «Як браты спяклі зайца» са зборніка П.Шэйна сюжэту «С.к.» папярэднічаюць тыпы СУС 1920 Н «Агонь за небыліцы», СУС 1886 «Чалавек хоча напіцца», СУС 1882 «Чалавек у дупле». Меншы брат апавядае дзедку, які расправіўся з яго братамі, як ён вылепіў з воску «кабылчыну», сеў на яе і паехаў, за пояс заткнуўшы сякеру. Сякера «так цюк, як цюк, так цюк...» — і адсекла зад кабылы. Герой пабег за задняй часткай, прыставіў, сшыў вярбовым калком. Вярба вырасла да неба, па якой ён і налез. Небыліца заканчваецца перамогай меншага